ДУК "Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма"
*Хрысаўская сельская бібліятэка*

Раённы конкурс
на лепшае краязнаўчае масавае мерапрыемства
"ПАЧАТАК УСЯМУ - ЗЯМЛЯ ТВАІХ БАЦЬКОЎ"

# Беларускі ручнік. Далучэнне да спадчыны

## Краязнаўчы дэсант



# Сцэнарый краязнаўчага дэсанту

У бібліятэцы афармлена выстава ручнікоў “Цяпло душы і рук набытак” народных умеліц вёсак Хрыса і Маневічы і кніжная выстава “Повязь часоў – беларускі ручнік”.

Мерапрыемства суправаджаецца мультымедыйнай прэзентацыяй “Беларускі ручнік – мінулае і сучаснасць”.

*Гучыць мелодыя беларускай народнай песні “Добры дзень вам, людзі”.*
*На фоне мелодыі выходзіць вядучы ў народным строі.*

***Слайд № 1.***

**Вядучы:** Добры дзень, слаўныя сябры!
Я шчыра вас вітаю
І куфар з вышытым дабром
Гасцінна адчыняю.

***Слайд № 2.***

А ў куфры – скарбы, тайнікі,
Тут розныя карункі.
Абрусы ёсць, палавічкі,
Да свята падарункі.
Не іх сягоння я
З куфэрачка дастану,
А з чэсцю пра другое я
Казаць вам зараз стану.
Прадстаўце сто гадоў таму
Дзяўчыну маладую.
Яна не за камп’ютарам сядзіць,
Яна над вырабам калдуе.
Гудзе завея за акном,
Гудзе без адпачынку,
А ля акна над ручнічком
Схілілася дзяўчына.
Дзе адшукала той узор
Руплівая дзяўчына?
Сабе ўявіце лета, бор,
Далёкія сцяжыны.
Зашыфраваны той узор
Раскажа вам пра лёс.
Майстэрства ў ім дзявочых рук,
У ім свет і прыгажосць.

І зараз, дзякуючы ёй,
Мы скарб увесь гэты маем,
І вось такую прыгажосць
Увазе вашай прадстаўляем.

Ручнічок, гэта белае дзіва,
Найтанчэйшы з кудзелі лянок,
Гэта гонар удалой маладзіцы,
Яе мары, жаданні і лёс.

**Вядучы:** З даўніх часоў сімвалам беларускай гасціннасці, адкрытасці і дабрабыту быў ручнік. І сённяшнюю нашу сустрэчу мы прысвяцілі менавіта яму. Таму што беларускі ручнік адносіцца да тых прадметаў народнага мастацтва, якія належаць і мінуламу, і сучаснасці. Папулярнасць яго нязменная, патрэба ў ім адчуваецца і ў нашы дні. Як і раней, ручнік абавязкова прысутнічае ў найбольш важныя, пераломныя этапы жыццёвага шляху чалавека: радзіны, хрэсьбіны, сватаўство, вяселле і пахаванне. Ручнік – рэч глыбока сімвалічная, шматзначная. Вышываная, узорыста вытканая тканіна ўпрыгожвае паўсядзённасць і адначасова з'яўляецца сімвалічным напамінам аб нябачных сувязях, што злітоўваюць чалавека з Богам, яго родам, продкамі. Польскі беларус Дзмітрый Шатыловіч напісаў вельмі пранікнёныя радкі, прысвечаныя беларускаму ручніку і яго шматзначнасці ў беларускіх народных традыцыях.

**Чытальнік:** У дзяцінстве маім беларускі ручнік
Быў аздобаю ў хаце і мэблі, і сцен.
Абдымаў дзве іконы ў кутку “багавік” –
Каляровы арнамент свяціўся ўвесь дзень.
Гаварыў ён са мной на мове ікон,
Упрыгожваў Дзеву Марыю з Хрыстом
І Міколу Святога, лампады агонь,
І здавалася мне: ратаваў ён наш дом.
І ў пакоях віселі кругом ручнікі –
Ля гадзінніка, люстры, пры самым акне.
Красаваліся кветкамі, быццам вянкі,
Ручнікі-красуны на кожнай сцяне.
І ручнік-уціральнік заўжды быў са мной.
І як мылі мяне, і як мыўся я сам,
Ён быў мягкі і гладкі пад маткі рукой
І мяне суцяшаў, як чароўны бальзам.
Гэты цуд-ручнікі ткала маці мая
І арнаменты ўсюды рукой нанясла,
А ў вайну, каб не згінуў я дзесь у баях,
Не адзін пад іконы ў царкву занясла.
У абрадах калісь беларускі ручнік

Быў і сімвалам шчасця, і скарбам жыцця,
Бо давалі яго ад бацькоў у разлік
Маладой у пасаг, як ішла да вянца.
І яна берагла той ручнік усё жыццё,
Ён у скрыні ляжаў, як святы талісман.
Забірала яго, як радзіла дзіцё,
Каб на хрэсьбінах выцерці змочаны стан.
Пры вянчанні ручнік на руках маладых
Іх супольна вязаў там на многа гадоў,
А падножнік-ручнік пад нагамі тады
Пакідаў ім на шчасце адбіткі слядоў.
Ручнікі на стале прыкрывалі хлеб, соль,
Каб яны прад усімі былі на віду,
Каб не толькі тут бачыла хатняя столь,
Што ў тым доме стаіць стол, багаты ядой.
А надзежнік-ручнік засланяў над дзяжой
Жаўтаватае цеста з пахучай мукі,
Як арліца крылом закрывае парой
Арлянят маладых ад варожай рукі.
Ручнікі нам у хаце тварылі вясну,
А зімой бераглі нас ад розных нядоль,
І пры смерці ўкладалі ручнік у труну,
Ручнікамі спускалі нябожчыка ў дол,
Бо ручнік спадарожнікам быў у сялян,
Ад дня родаў да смерці ён з імі ішоў
Праз пагоду і лівень, і праз ураган.
Ён заўсёды быў з імі, як у жылах іх кроў.

*Д. Шатыловіч. Беларускі ручнік*

**Вядучы:** Як выглядаў старажытны беларускі ручнік? Ён быў трошкі меншы па сваіх памерах за сучасны, вырабляўся нескладанымі спосабамі ткацтва. Да найбольш пашыранага тыпу аднасіцца кампазіцыя з адной ці некалькіх папярочных палос-бардзюраў, падпарадкаваных адзін аднаму і ўтвараючых адзінае цэлае. Арнамент ручніка звычайна багаты і разнастайны. На рубяжы 19-20 стст. у ім пераважалі даўнія ромба-геаметрычныя ўзоры, потым з'явіліся раслінныя матывы. У колеравых адносінах пераважалі шэра-белыя ці прыглушаныя чырвона-карычневыя адценні льнянога прадзіва.

***Слайд № 3.***

**Вядучы :** Ёсць неабвяргальныя сведчанні існавання ручніка ў вельмі аддаленыя ад нашага часу эпохі. Падобны выраб адлюстраваны на гравюры "Ф. Скарына", змешчанай у Біблії 1517 − 1519 гг., дзе вядомы асветнік паказаны за маленькім рабочым столікам, пакрытым багата арнаментаваным

ручнікам. Наяўнасць ручніка, ды яшчэ ў цэнтральнай частцы гравюры, наўрад ці выпадковая. Трэба думаць, наш славуты першадрукар быў добра знаёмы з культурай сваёй зямлі. Таму тканіна на гравюры сканцэнтравана перадае выразныя рысы беларускага ручніка: ромба-геаметрычны арнамент, скампанаванасць яго ў папярочныя палосы, разбеленасць фонам, доўгія махры.

***Слайд № 4.***

**Вядучы:** Ручнікі ткалі на кроснах “верстат”. Гэта такі драўляны станок, які прызначаўся для ткацтва. Ніткі пралі з кудзелі льну на пралках. Наматвалі на верацяно. З верацяна – на цэўку (палачку з маліны). Гэта рабілася з дапамогай сукайла. Затым цэўка ўстаўлялася ў чаўнок. Жанчына садзілася за кросны, і чаўнок у яе руках хадзіў туды-сюды па нацягнутых нітках у кроснах. Так яна ткала доўгімі зімовымі вечарамі ручнікі і проста палатно.

***Слайд № 5.***

**Вядучы:** Палатно атрымоўвалася шэрае, трэба было яго адбяліць. Адбельвалі попелам у цаберку. У цэбер складвалася палатно, залівалася вадой, перасыпалася попелам і адмакала пэўны час. Затым жанчыны вынімалі яго і ішлі да рэчкі, рассцілалі на траве, пасыпалі зноў попелам і білі прачамі. Добра прапаласкаўшы, зноў рассцілалі на траве, сонца высушвала і дабельвала тканіну. Такая тканіна была вельмі здаровая і прыемная да цела.

**Чытальнік:**

Палатна сувоі белыя, льняныя
стаяць, нібы сваі цёсаныя тыя,
спрадзеныя тонка, вытканыя туга,
выбеліў іх травень сонейкам і лугам.
Вечарамі колькі трэба было прасці,
колькі ткаць, бяліць, пакуль у куфар скласці.

*Л. Геніюш. Куфар (урывак)*

***Слайд № 6.***

**Вядучы:** У залежнасці ад прызначэння і функцыі ручнікі маюць розныя назвы.

Для выцірання твару
Пасля мыцця ў спякоту
Ручнік-уцірач у руках
Пасля цяжкой работы.
Ён пахне жытам, хлебам,
Вясёлкаю ён ззяе
І сонечным праменнем
Душу абаграває.

Ручнікі ўтылітарныя паўсюдна на Беларусі называюцца “ўціральнік”, “уцірач”, “уцірка” – кавалак тканіны без дэкору ці з вузенькімі палоскамі-

пературамі па краях, – які выкарыстоўваюць для побытавых патрэб (імі ў паўсядзённым жыцці выціралі рукі і твар). Прычым на патрэбу сям'і выдзяляўся толькі адзін ручнік, які звычайна вісеў пасярэдзіне сцяны. У лазню яго не бралі.

***Слайд № 7.***

**Вядучы:**

А побач у куточку
Яшчэ адзін ляжыць.
Памерам невялічкі
І зусім ён не блішчыць.
А нават брудны трошкі,
Бо ў полі ён бываў,
Трапкач ён называўся,
Ён ежу зберагаў.
У ім дажджу крупінкі
І ветрыка павеў,
Пах той лясной хваінкі
Адчуеш і цяпер.
Не раз жанчына ў полі
Збанок у ім нясла.
Хавала дзесьці ў голлі,
Ад звера берагла,
А ён гатовы й сёння
Усім верненька служыць,
Але няма патрэбы,
Таму ён тут ляжыць.

**Вядучы:** Да ліку ручнікоў утылітарнага значэння належаў скарач, ці трапкач – маленькі, квадратнай ці падоўжанай формы, неад'емнай прыналежнасцю якога былі доўгія махры, часам акуратна спавітыя прыгожымі шнурамі-кутасамі. Скарачы, звычайна больш складаныя за ўціральнікі па каларыце, спосабах выканання, ніколі не ткаліся асобным вырабам, а адразаліся ад простага ці ўзорыстага палатна. Яны ўжываліся для выцірання посуду, рук, а пругка сплеценымі кутасамі іх на скорую руку білі дзяцей. Галоўная ж функцыя такога ручніка – зручная, лёгкая і танная прылада для пераносу керамічнага посуду з ежай. Сабраныя наверсе вакол пасудзіны доўгія махры ўтваралі ручку, што дазваляла зручна пераносіць палявыя гаршкі з хаты на сенажаць ці жніво.

***Слайд № 8.***

**Чытальнік:**

Прыбраць жыллё да свята
Традыцыя святая.
І кут чырвоны ў хаце
Вясёлкаю заззяе.

Нішто так не прывабіць,
Не дасць так хараство –
Ручнік! З ім светла ў хаце,
З ім мары і жыццё.
А той, што на іконе,
Набожнікам завуць.
У ім як на далоні
Выявы ўсе ўстаюць.
А каларыт які, глядзіце:
Чырвоны – кроў Хрыста,
А чорны – то ж зямелька наша.
Праўдзівы сэнс быцця.

**Вядучы:** Ручніковая тканіна, прызначаная для ўпрыгожвання абразоў і бажніц, называлася “набожнік”. Злучанасць гэтай рэчы з абразамі, з чырвоным кутом адлюстравана ў лакальных назвах: “набразнік”, “абразны ручнік”, “накутнік”, “багавік”, “завеска”, “плат”, “платок”, “набожны платок”. Ён вылучаўся выразнай дэкаратыўнасцю і пэўнай даўжынёй, якая вар’іравалася ад 2 да 5 метраў у залежнасці ад памераў бажніцы і колькасці абразоў. Пакрывалі бажніцу звычайна адным суцэльным вырабам, іншы раз вылучаючы галоўны абраз асобным, найлепш аздобленым набожнікам.

***Слайд № 9.***

**Вядучы:** Яшчэ адным відам ручнікоў была намітка – своеасаблівы галаўны ўбор беларускіх жанчын. Канцы ручніка намотвалі, завівалі, мудрагеліста абкручвалі вакол галавы, пакідаючы свабодным толькі твар. Напрыканцы 19 – пачатку 20 ст. яе насілі жанчыны нашай мясцовасці. У кожным рэгіёне наміткі павязвалі па-рознаму. Як насілі менавіта ў нас, нам не ўдалося адшукаць звестак, бо няма ў жывых носьбітаў падобнай інфармацыі.

***Слайд № 10.***

**Вядучы:** Самым высокім статутам надзяляліся абрадавыя, або рытуальныя ручнікі, багата аздобленыя натыканнем, вышыўкай, карункамі. Абрадавыя ручнікі выкарыстоўвалі ў святы і ў абрадах. Яны былі ўпрыгожаны арнаментальнай вышыўкай з кветак, геаметрычных сімвалаў (круг, крыж, ромб) і чароўных птушак. У якасці фарбаў для пражы выкарыстоўвалі расліны. Чорны колер атрымлівалі пры дапамозе бабоўніку ці змешвалі сок буракоў з настоем кары вольхі. Чырвоны – рабілі з настою валошкі, адвару сырой мацярдушкі, адвару сырой кары рабіны. Для зялёнага колеру выкарыстоўвалі лісты бярозы, адвар з сырых лістоў каманімніка.

***Слайд № 11.***

**Чытальнік:** А колькі на вяселле патрэбна ручнікоў?

Ёсць дзіўнае павер'е –
Не меней, чым нявесце маладой гадоў.
Пасаг сабе дзяўчына рыхтавала загадзя.
Тут падарункі свату
І родным жаніха.

**Вядучы:** А давайце палічым, на якіх этапах сённяшняга вяселля трэба ручнік:

- для каравая;
- пад ногі маладым;
- падчас вянчання на абразы;
- для перавязвання сватоў.

І гэта пры такім усечаным сённяшнім вясельным абрадзе. А раней (старыя людзі кажуць) для вяселля трэба было мець каля 40 ручнікоў. Прычым, са сваімі "залатымі" правіламі да аздаблення і шанавання такіх ручнікоў. Напрыклад:

- нельга вышываць вясельныя ручнікі ўначы - тым часам сутак вышываюць толькі магічныя рэчы;
- ручнік – гэта дарога жыцця, таму палатно яго павінна быць цэлым і беспарапынным, як жыццё (не ўстаўляйце ў сярэдзіну ручніка ніякіх карунак ці мярэжак - гэтым вы нашкодзіце, разрэзанае жыццё ўжо не сшыеш, як бы ні імкнуўся);
- усе памеры ручніка (шырыня, даўжыня) павінны падзяляцца на сем;
- вясельныя ручнікі, асабліва пад ногі, выкарыстоўваюць адзін раз! У выпадку вельмі шчаслівага сямейнага жыцця ў спадчыну перадаюць толькі ўзор, а ручнік вышываецца новы.

***Слайд № 12.***

**Вядучы :** Жанчыны, якія ткалі ручнікі, напаўнялі глыбінным зместам гэтую "белую дарогу жыцця". Можна гаварыць пра тое, што ўзоры вышываных ручнікоў – гэта зашыфраваны аповед асобных момантаў жыцця народа. Вось паглядзіце. Арнамент ручніка змяшчае выявы галубоў. Голуб – сімвал кахання. Голуб ідзе за галубкай – першае знаёмства хлопца з дзяўчынай, каханне толькі пачынаецца. Дзве птушачкі, павернутыя галоўкамі адна да адной – каханне ў самым росквіце. Калі ж вышытыя птушачкі павернутыя ў розныя бакі – каханне без узаемнасці. Дык ці пра шчаслівае каханне расказвае гэты ручнік? А вінаградная лаза сімвалізуе пладавітасць, багацце. Гэта Божы знак. Не аднойчы вінаградную лазу мы бачым на прадметах царкоўнага ўжытку.

**Вядучы:** Ручнікі для падарункаў мелі назву "платкі", спецыяльна прызначаныя для выканання пэўнага абраду – "абыдзеннікі". Відазмененай формай абрадавага ручніка быў і надзежнік – палатняная накрыўка для

дзяжы. Яго таксама выкарыстоўвалі на ўрачыстым паднашэнні гасцям каравая з хлебам-соллю. Гэта адзін са шматлікіх прыкладаў найцяснейшай сувязі ручніка з хлебам.

**Чытальнік:** У будні і ў святы ручнік на сцяне,
Валошкі, рамонкі ідуць па “канве”.
Яго вышывала матуля мая,
Каб у хаце жылі прыгажосць, дабрыня.
Хлеб з печы духмяны заўжды на стале,
Ручнік яго першым прытуліць к сабе.
Ласкава накрытыя боханы млеюць
І дзён гэтак з дзесяць – зусім не чарсцвеюць.
Бо гэты ручнік даматканы, чысцюткі,
Як сэрца матулі і шчодры, і чуткі.
Ручнік, каравай – так гасцей сустракаюць,
На шлюб маладых ручніком бласлаўляюць.
У роднай старонцы, у кожнай хаціне
Ручнік з абразамі, ручнік на дзяціне.
Яго ў пасаг нам дзяды завяшчалі,
Каб талент народа ў вяках шанавалі.

*Л.Валасевіч. Ручнік*

***Слайд № 13.***

**Вядучы:** Аброчныя (запаветныя) ручнікі, ці ручнікі-абярэгі, прыносілі па абяцанні ці запавеце на абракальныя, прыдарожныя і раскрэсныя крыжы, прошчы, святыя крыніцы, святыя дрэвы як ахвяру, дар, як сродак усталявання чалавекам кантакту з вышэйшым светам, індывідуальную просьбу да Бога**.** Ручнік ператвараўся ў магічную рэч, здольную адхіліць ліха і смерць. Так, у вайну і часы ліхалецця ці эпідэмій жанчыны ўсёй вёскі збіраліся ў адной хаце і за адну ноч павінны былі напрасці і выткаць адзін ручнік-абярэг, каб адхіліць ліха ад вёскі.

**Вядучы:** Шмат стагоддзяў карыстаюцца беларусы ручніком. Ткуць і вышываюць яго і сёння. Наша мясцовасць таксама багата на таленавітых жанчын, якія займаюцца гэтай справай. На першы погляд гэта простыя, сціплыя, вясковыя жанчыны. Але, гледзячы на іх работы, на тое, як яны ўмеюць падабраць узор ручніка, якім колерам яго расшыць, разумееш, якая ў іх прыгожая душа і багаты ўнутраны свет.

***Слайд № 14.***

**Вядучы:** Жыве ў вёсцы Хрыса прыгожая, жыццярадасная, таленавітая жанчына Надзея Канстанцінаўна Мурына. Родам яна з вёскі Лісічыцы. Вышываць пачала з маленства. Працавала малярам- штукатурам на Бярозаўскай ДРЭС, а ўвесь свой вольны час вышывала, і зараз, будучы ўжо на заслужаным адпачынку, працягвае займацца любімай справай. Яе работы

экспанаваліся на розных выставах, як раённых, так і абласных . А колькі разоў мы звярталіся да яе за дапамогай у арганізацыі выставы народнай творчасці, то і цяжка злічыць. Ні адна наша выстава не абыходзіцца без яе работ. Аднойчы дырэкцыя Бярозаўскай ДРЭС звярнулася з просьбай да Надзеі Канстанцінаўны вышыць карціну-калаж нашага краю для падарунка прэзідэнту Рэспублікі Беларусь А. Г. Лукашэнка. Атрымалася так, што да прыезду высокага госця ў Белаазёрск яна не паспела вышыць яе. Работа была закончана праз некаторы час, і яе забралі ў музей Бярозаўскай ДРЭС. Зараз яна знаходзіцца ў музеі “Брэстэнерга”. Надзея Канстанцінаўна не толькі вышывае, яна выдатна спявае. Нездарма ў народзе кажуць, што таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім.

***Слайд № 15.***

**Чытальнік:** Бялюткія на сценах ручнікі.
Прыгожых мараў мамы яны сведкі,
А кветкі – не знайсці ў жыцці такіх,
Шукай такія ў райскім садзе кветкі.
Вунь колькі іх – вялікіх і малых,
Агністых і ружовых, жоўтых, сініх,
У кошыках, вяночках і без іх,
На ручніках, дарожках і прасцінах.
А мама нешта вышывае зноў.
За вокнамі мяцеліца гуляе.
Аб чым ты, мама, марыш між снягоў?
Дзе, у якіх цяпер блукаеш далях?
А кветкі яркія, як памяць аб тых днях,
Дзе песня твая лепшая не спета…
Вятры злуюць, галосяць у снягах,
А ў хаце мамінай красуе лета.

*З. Мінчанка. Бялюткія на сценах ручнікі*

***Слайд № 16.***

**Вядучы :** Не толькі ў сваёй вёсцы, але і па ўсёй акрузе славіцца жыхарка вёскі Маневічы Лідзія Антонаўна Тарасюк сваімі вытканымі прыгожымі ручнікамі. Нарадзілася яна ў 1936 годзе. Складаны лёс выдаўся ў гэтай жанчыны. У 32 гады яна засталася ўдавой з сям’ю дзяцьмі на руках, наймалодшаму з якіх было толькі тры гады. Жыццё было цяжкім. Трэба было працаваць і працаваць, каб пракарміць вялікую сям’ю адной. Так, прыйшоўшы з працы, яна садзілася за верстат і ткала ручнікі. “Вельмі хацелася, каб мае дзеці мелі ўсё неабходнае, таму прала і ткала нават уначы”, – расказвае Лідзія Антонаўна. Да вайны нашы прадзеды ткалі ручнікі чырвонага і чорнага колеру, а пасля вайны жыццё палепшылася, і арнамент ручнікоў змяніўся. На ручніках робіцца такі ўзор, які павінен вабіць вока. Яна не проста тчэ свае ручнікі, яна стварае свой непаўторны

ўзор. Ручнікі Лідзіі Антонаўны неаднаразова ўзнагароджваліся на раённых і абласных выставах. Яе работы былі прадстаўлены на рэспубліканскім конкурсе "Беларускі мацярык" у зале музея Я. Купалы. ніхто не мог паверыць, што ручнікі тканыя і прыйшлося іх пранесці перад прысутнымі.

***Слайд № 17.***

**Вядучы :** Прадстаўнікі конкурсу з усёй Беларусі стоячы апладзіравалі нашай зямлячцы, у якой сапраўды залатыя рукі. Вось такую прыгажосць змагла зрабіць простая вясковая жанчына.

***Слайд № 18.***

**Чытальнік:**

З каласоў жытнёвых ён сатканы,
Наш ручнік, наш беларускі ўзор.
Васільком, пралескай вышываны,
Хвалямі блакітнымі азёр.
Наш ручнік, як золата, свіціцца,
Кветкамі вясновымі цвіце
І ў прасторных хатах, у святліцах
На вяселлі радуе гасцей.
Быццам веюць ветрыкам дубровы
І прыемнай свежасцю сады,
І пад лёгкі шолах ручнікова
Песні, пацалункі маладых.
Зіхаціць ручнік наш саматканы,
Родны беларускі наш узор,
І глядзіш, глядзіш зачараваны –
На дзівосны, казачны ўбор.

*А. Дзеружынскі. Наш беларускі ручнік*

***Слайд № 19.***

**Вядучы :** Такім чынам, мы бачым, што ручнік – гэта сімвал чалавечага жыцця, сімвал жыццёвай дарогі кожнага чалавека. Як вы думаеце, чаму нашу Радзіму называюць Белай Руссю? Існуе некалькі тлумачэнняў. Адны лічаць, што наша зямля атрымала такую назву, бо не была заваяваная іншаземцамі (белая – значыць чыстая, вольная, незалежная). Другія мяркуюць, што белае льняное адзенне, светлыя валасы нашых продкаў паслужылі для яе назвы. А можа, так зямля стала называцца ад ручнікоў, разасланых па берагах рэчак і азёраў, якія ад сонца і вады станавіліся бялюткімі - бялюткімі? Ад тых палатняных белых ручнікоў-крылаў, што ў кожнай нашай хаце…

*Гучыць песня "Зямля мая",*
*на фоне песні паказваецца фотадасье нашага*
*Хрысаўскага краю*

*Слайд №№ 20, 21.*

## Спіс выкарыстанай літаратуры:

**Беларускі** ручнік: зборнік паэзіі / уклад. Т. А. Ускова. – Мінск : Выдавецкі дом "Звязда", 2013. – 221,[3] с.

**Дзеружынскі, А. С.** Вернасць : вершы / Авяр'ян Дзеружынскі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1998. – 271 с.

**Курилович, А. Н.** Белорусское народное ткачество / Анна Николаевна Курилович ; ин-т искусствовед., этнограф. и фолькл. – Минск : Наука и техника, 1981. – 119 с.

**Лабачэўская, В. А**. Повязь часоў – беларускі ручнік / Вольга Лабачэўская ; кансульт. М. Віннікава; фота Г. Ліхтаровіч. – Мінск : Беларусь, 2002. – 232 с.

**Лабачэўская, В. А.** Повязь часоў – беларускі ручнік : альбом / Вольга Лабачэўская ; рэц. Я. М. Сахута, В. С. Цітоў ; пер. на англ. мову С. К. Сіверына. – Мінск : Беларусь, 2009. – 295 ,[5] с.

**Сахута, Я. М.** Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва / Яўген Міхайлавіч Сахута ; рэц. Т. Б. Брацкая. – Мінск : Беларусь, 2001. – 110 с.

**Сахута, Я. М.** Беларускае народнае мастацтва / Яўген Міхайлавіч Сахута ; рэд. Г. П. Падбярэзскі. – Мінск : Беларусь, 1980. – 154 с.

**Сахута Е. М**. Народное искусство и художественные промыслы Белоруссии / Е. М. Сахута ; ред. Г. С. Метер. – Минск : Полымя, 1982. – 95 с.

**Сахута Я. М.** Фарбы роднай зямлі : нарысы / Яўген Міхайлавіч Сахута ; рэц. А. К. Лявонава, М. М. Чарняўскі. – Мінск : Народная асвета, 1985. – 191 с.

**Традыцыйная** мастацкая культура беларусаў : у 6-ці т. Т. 4. / А. М. Боганева, М. М. Валодзіна, М. М. Віннікава [і інш]. – Мінск : Вышэйшая школа, 2009. – 863,[1] с.

**Традыцыйная** мастацкая культура беларусаў : у 6-ці т. Т. 4. / В. І. Басько, Т. Б. Варфаламеева, Т. В. Валодзіна [і інш]. – Мінск : Вышэйшая школа, 2008. – 559, [1] с.

**Фадзеева, В. Я.** Беларускі ручнік / В. Фадзеева ; афарм. І. А. Дзямкоўскага. – Мінск : Полымя, 1994. – 327 с.

**Складальнік:** Наталля Міхайлаўна Філіпчук,
бібліятэкар Хрысаўскай СБ